Шыфр:________________________

Колькасць балаў:______________

Месца:_______________________

Зацвярджаю

Намеснік старшыні арганізацыйнага камітэта намеснік Міністра адукацыі

______________ В.А. Будкевіч

«12» ______03______2013 года

ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXIX РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» І
«БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Брэст, 2013 г.*

## 11 клас

| **Заданні** | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

## Варыянт І

**Заданне 1.** Падкрэсліце правільныя напісанні *Е* і *Э* ў запазычаных словах.

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

Менеджмент – мэнэджмэнт, бенэфіс – бенефіс, бейдж – бэйдж, сэрвіс – сервіс, фанабэрысты – фанаберысты, экземпляр – экзэмпляр, эсенцыя – эсэнцыя, тунель – тунэль.

**Заданне 2.** Запішыце па *2 розныя* словы беларускай мовы, утвораныя ад наступных лацінскіх слоў.

***Узор:*** *civis ‘грамадзянін, дзяржава’ – цывілізацыя, цывільны, цытадэль*

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| **Лацінскае слова** | **Словы ў беларускай мове з гэтымі каранямі** |
|---|---|
| **caput** ‘галава, глава’ | |
| **curro, cursum** ‘бегчы’ | |
| **lego** ‘збіраць, чытаць’ | |

**Заданне 3.** Запоўніце табліцу, склаўшы і запісаўшы 2 сказы, у якіх *ПРЫЧЫМ /ПРЫ ЧЫМ* выконваюць розную сінтаксічную ролю.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| Сказ | Часцінамоўная прыналежнасць *ПРЫЧЫМ /ПРЫ ЧЫМ* | Сінтаксічная роля *ПРЫЧЫМ /ПРЫ ЧЫМ* |
|---|---|---|
| 1) | | |
| 2) | | |

**Заданне 4.** Запішыце значэнне фразеалагізмаў з кампанентам ***ГАРЭЦЬ***.

*Максімальная колькасць балаў – 10.*

| Фразеалагізм | Значэнне фразеалагізма |
|---|---|
| *вока гарыць на што-н.* | |
| *гары яно гарам* | |
| *гарыць зямля пад нагамі* | |
| *гарэць на працы* | |
| *на злодзеі і шапка гарыць* | |
| *не гарыць* | |
| *нутро (душа) гарыць* | |
| *скура гарыць* | |
| *у руках усё гарыць* | |
| *як мокрае гарыць* | |

**Заданне 5.** Адзін з прыведзеных беларускіх назоўнікаў у параўнанні з рускай мовай не змяніў сваёй родавай прыналежнасці.

Падкрэсліце назоўнік і знайдзіце граматычнае абгрунтаванне гэтай "стабільнасці".

*Максімальная колькасць балаў – 3* (1 бал – за назоўнік, 2 балы – за абгрунтаванне).

Гавань, мель, наледзь, ростань, печань, цень, цвіль.

АБГРУНТАВАННЕ: ____________________________________________
____________________________________________
____________________________________________
____________________________________________
____________________________________________

**Заданне 6.** Рашыце сэнсавыя прапорцыі.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

Запальваць : гасіць = будзіць **:** ($x_1$) ________________ = ($x_2$)______________ : зачыняць = ствараць: ($x_3$)______________________.

**Заданне 7.** Запішыце тры сказы, у якіх дзейнік і дапаўненне ўступаюць у аманімічныя аносіны, гэта значыць мяняюцца сінтаксічнымі ролямі.

**Узор**: *Быццё вызначае свядомасць.*

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

АДКАЗ : 1. ______________________________
2. ______________________________
3. ______________________________

**Заданне 8.** Пісьмова адкажыце на наступныя пытанні.

*Максімальная колькасць балаў – 4* (1 бал за кожны правільны адказ).

**1.** Асноўная ідэя апавядання М. Стральцова – *"прымірыць горад і вёску ў сваёй душы"* – выяўляецца ў яго загалоўку.

Як называецца гэты твор? „Сена на асфальце"

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: ______________________________

**2.** Да якой п'есы А. Макаёнка эпіграфам узяты прыказкі *"Што пасееш, тое і пажнеш"*, *"Як аукнецца, так і адгукнецца"*?

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: Пагарэльцы

**3.** Сімвалам чаго з'яўляюцца спарышы ў аднайменным вершы П. Панчанкі?

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: еднасці, братэрства, кахання

**4.** Каму прысвяціў Р. Семашкевіч наступныя радкі: *"На ўсю Беларусь мільён пракурораў / І толькі адзін, толькі ён адвакат"*?

Запішыце імя гэтага пісьменніка.

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: Ф Багушэвіч

**Заданне 9.** . Запішыце нумары правільных сцверджанняў.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

\+ 1) У паэме "Песня пра зубра" вобраз князя Вітаўта падаецца ў якасці ідэальнага кіраўніка дзяржавы.

\+ 2) Верагодным аўтарам паэмы "Тарас на Парнасе" даследчыкі называюць К. Вераніцына.

— 3) У рамане І. Шамякіна "Сэрца на далоні" Тарасаў папракае Шыковіча (Гукана): *"Дрыжаў за сваю шкуру... Дрыжаў, як апошні баязлівец. Страціць партызанскую славу, кар'еру – вось чаго ты баяўся!"*

\+ 4) У творчасці М. Багдановіча вобразам-сімвалам красы і мастацтва з'яўляецца кветка васілёк.

— 5) Жанравай прыхільнасцю В. Быкава была паэма. аповесць

— 6) М. Танк – аўтар цыкла вершаў "Іранскі дзённік". П. Панчанка

\+ 7) Першы (зрэшты, і апошні) прыжыццёвы зборнік вершаў А. Гаруна называўся "Матчын дар".

— 8) Вядомыя словы Ф. Багушэвіча *"Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!"* увайшлі ў прадмову да зборніка "Смык беларускі". Дудка бел.

— 9) Падзеі імперыялістычнай, грамадзянскай, Вялікай Айчыннай войнаў паказаны ў рамане "Людзі на балоце".

+ 10) Санет – верш з чатырнаццаці радкоў, пабудаваны па пэўнай страфічнай схеме з жорсткай схемай рыфмаў.

ПРАВІЛЬНЫ АДКАЗ: ____________________________________________

**Заданне 10.** Перад вамі *цэнтон* – верш, складзены з урыўкаў розных твораў аднаго ці некалькіх паэтаў.

Запішыце імёны і прозвішчы аўтараў асобных радкоў і назвы твораў, адкуль яны ўзятыя.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

З надзеяй гляджу на крыніцу спатканую,
Хачу, каб яна разлілася ракой...
Не Волгай магутнай,
Не нават Камаю,
Хоць Бесяддзю, што на радзіме маёй.
Сакавітыя пожні мурожныя
Не заменіш нічым і нідзе
І зямлю, дзе сцяжыначка кожная
У прыветлівы двор прывядзе.
Няма такіх нетраў, глыбокага мора
І гор, праз якія б ты не правяла
Мяне на радзіму...

АЎТАРЫ І НАЗВЫ
ІХ ТВОРАЎ: ____________________________________________
____________________________________________
____________________________________________
____________________________________________
____________________________________________
____________________________________________
____________________________________________